*Сувалаў А. М.* **Погляды І. А. Ласкова на праблему этнагенезу беларусаў**

У часы існавання СССР для беларуса, які пражываў на прасторах Саюза, малой радзімай была перш за ўсё яго родная рэспубліка – Беларусь, а ўжо пасля – тое месца, дзе ён нарадзіўся і вырас. Менавіта такім беларусам, які пражываў па-за межамі малой радзімы ў апошні перыяд існавання СССР і быў Іван Антонавіч Ласкоў. Лёс вызначыў у якасці месца яго сталага пражывання Якуцію, але да канца свайго жыцця І. Ласкоў не страціў сувязі з Беларуссю. Яго публікацыі, якія тычыліся праблемы этнагенезу беларусаў, пабачылі свет у перыяд перабудовы. Гэтая акалічнасць істотна для разумення, чаму менавіта ў гэты час былі апублікаваны яго працы, чаму яны не выклікалі дастатковага рэзанансу з боку даследчыкаў-прафесіяналаў, і чаму пазіцыі, выказаныя І. Ласковым, былі даволі спрыяльна ўспрыняты беларускай грамадскасцю.

Перабудова з яе імкненнем пашырыць плюралістычныя падыходы як у сферы ідэалогіі, гэтак і ва ўжытку выкарыстоўваемых сацыяльнымі навукамі метадалогій, спрыяла ўсплеску цікавасці тагачаснага грамадства да сваёй гісторыі. Асаблівую зацікаўленасць грамадства праяўляла да гэтак званых «белых плямаў» гісторыі. Значнае месца ў зацікаўленасці тагачаснага беларускага грамадства мела і цэнтральная праблема любога народа − праблема этнічнага паходжання, этнічнай гісторыі. Значны рост інтарэсу да гэтай тэматыкі быў выкліканы шэрагам падстаў. Па-першае, працэсы перабудовы грамадства прыводзілі да абуджэння інтарэсу літаральна да ўсіх бакоў сацыяльнага жыцця. Па-другое, пашырыўся доступ да матэрыялаў, якія раней былі недаступныя цалкам, або доступ да іх быў надзвычай ускладненым: гэта і архіўныя матэрыялы, і публікацыі, якія знаходзіліся ў спецсховішчах з-за іх ідэалагічнай неадпаведнасці, або антысавецкай дзейнасці іх аўтараў, публікацыі самавыдавецкія, паколькі пэўныя аўтары ў савецкі перыяд не маглі выдаваць свае творы з-за таго, што выказваемыя ў іх пазіцыі не зусім адпавядалі афіцыйным падыходам і трактоўкам.

Недахоп інфармацыі разам з ростам запатрабаванасці ў новых поглядах і падыходах да вышэй азначаных праблем выклікаў з’яўленне вялікай па колькасці літаратуры featured рознага ўзроўню і якасці.

Ліквідацыя старой ідэалагічнай дактрыны дазваляла выкарыстоўваць розныя методыкі даследаванняў, прыцягваць матэрыялы былых ідэалагічных праціўнікаў або проста непрыхільнікаў савецкай сістэмы не толькі з мэтай іх крытыкі, яле і з мэтый уласна навуковага аналізу, навуковай дыскусіі, ці проста пошуку ў іх цікавых момантаў і аспектаў айчыннай гісторыі. Падобнага роду працэссы прыводзілі як да апублікавання грунтоўных прац калісьці забароненых або напісаных «у стол», так і да з’яўлення свежых ідэй яшчэ слаба апрацаваных і таму недасканалых па сваіх структуры, логіцы і аргументаванасці. Менавіта да апошніх, на наш погляд, трэба адносіць публікацыі І.А. Ласкова. Сутнасць поглядаў І. Ласкова заключаецца ў прызнанні ўдзелу фіна-ўгорскага субстрату ў этнагенезе беларусаў. Пазіцыі аўтара фарміраваліся пад яўным уплывам асабліва папулярнай у той час «тэорыі балцкага субстрату» В.В. Сядова, згодна з якой беларусы як этнас сфарміраваліся пад уплывам балцкага насельніцтва даславянскай Беларусі. Аналагічна В.В. Сядову, І. Ласкоў імкнуўся даказаць, што беларусы ў сваёй этнічнай гісторыі адчулі на сабе моцны ўплыў фіна-ўграў. Іншымі словамі кажучы, фіна-ўгры выступалі ў якасці субстрату для беларускага этнасу.

Калі разглядаць пазіцыі І. Ласкова з уласна навуковых падыходаў, то першае, на што неабходна ўказаць, − гэта слабая навуковая аргументацыя абгрунтавання пранапаванай навуковай гіпотэзы. Фактычна асноўным і бадай адзіным аргументам, на якім былі пабудаваны разважанні аўтара, было супадзенне некаторых слоў мовы беларускай са словамі фіна-ўгорскага паходжання. Шляхам супастаўлення слоўнікаў беларускай і living рознымі гаворкамі і дыялектамі перш за ўсё ўгорскіх моў І. Ласкоў знаходзіў паралелі і супадзенні ў іх лексіках. Адсюль ён і рабіў выснову пра ўдзел фіна-ўграў у этнагенезе беларусаў.

Для спецыяліста, які даследуе праблему этнагенезу, важна комплекснае вывучэнне разглядаемай праблемы. Зразумела, што калі ўдзел субстрату ў фарміраванні пэўнага этнасу меў месца, то яго ўплыў будзе фіксавацца не толькі ў мове, ён знойдзе свой след і ў фальклоры, і ў матэрыяльнай культуры (этнаграфічныя матэрыялы, асаблівасці архітэктурных збудаванняў, прылад працы), а таксама адаб’ецца і ў іншых сваіх праявах. Ні ў якім разе не

прыніжаючы гонар паважанага І. Ласкова, трэба канстатаваць, што яго даследаванні – гэта толькі першыя спробы даследчыка-рамантыка, які знайшоў цікавыя супадзенні і паралелі, і на іх аснове адразу паспрабаваў зрабіць абагульняючыя высновы. Безумоўна таксама, што яго погляды нельга назваць «фіна-ўгорскай канцэпцыяй паходжання беларусаў», як час ад часу гэта гучыць у навукова-папулярнай літаратуры. Канцэпцыя прадугледжвае стройную сістэму поглядаў, якая абгрунтавана і падмацавана фундаментальнымі даследаваннямі. Іван Антонавіч, калі судзіць па яго публікацыях, быў чалавекам захапляючымся і, безумоўна, таленавітым. Але яго публікацыі, галоўнае месца сярод якіх займае «Летапісная Літва: сваяцтва і лёс» (некалькі выданняў), носяць усё-ж такі навукова-папулярны характар.

Выклікае пытанне і той момант, што І. Ласкоў не супаставіў колькасныя пакажчыкі сэнсавых супадзенняў паміж разглядаемымі мовамі з тымі варыянтамі, калі падобныя пераклады не мелі ніякага супадзення. Іншымі словамі кажучы, наколькі выкарыстанная методыка даследавання мела рэпрэзентатыўныя пакажчыкі. Калі адкідваць гэты момант, то адмыслова шукаючы супадзенні можна даказваць блізкасць практычна любых выпадкова ўзятых моў. Шукаючы блізкасць і сэнсавыя паралелі, і не звяртаючы ўвагі на асноўны масіў, што адназначна адрознівае разглядаемыя мовы паміж сабою, можна знайсці блізкасць там, дзе яе проста няма.

Погляды І. Ласкова на этнагенез беларусаў прадстаўляюць сабой навукова-папулярны падыход даследчыка-дылетанта, або менш агрэсіўна, даследчыка-рамантыка, заснаваныя на абсалютызацыі аднаго моманту: частковага супадзення нязначнай часткі лексічнага матэрыялу беларускай мовы з фіна-ўгорскімі мовамі. Сыходзячы са сказанага вышэй, «фіна-ўгорскую канцэпцыю паходжання беларусаў» І. Ласкова можна разглядаць як рабочую гіпотэзу, ці, у лепшым выпадку, як навукова-папулярную тэорыю, якая на сённяшні час мае чыста гістарыяграфічнае значэнне.

## *Старжинский В.П.* **Роль дисциплины в инновационном развитии**

Покупая сложные электронные приборы, наши соотечественники, как правило, спрашивают: «А чья сборка?». Если японская –